выснову, што “падрыхтоўка савецкіх спецыялістаў не адпавядае патрабаванням, умовы працы дрэнныя”. Адзначаліся частыя выпадкі крадзяжоў мясцовымі работнікамі ў замежных спецыялістаў некаторых дэталей кантрольна-вымяральных прыбораў, інструмента, насільных рэчаў, нават канцылярскіх прыналежнасцей. Да таго ж: “ва ўсіх прадуктовых крамах, нават агароднінных, уладкована сігналізацыя”, “у крамах самаабслугоўвання падвойны кантроль – у касы і на выхадзе, гэта ж абраза, няма даверу да людзей” адсюль высновы: “значыцца ў гэтым ёсць неабходнасць” і “Магілёў – сталіца крадзяжоў” [5, арк. 20адв., 21].

Параўноўваліся ўмовы жыцця савецкага Магілёва і гарадоў усходняй Германіі, дзе таксама будаваўся сацыялістычны лад: “Умовы жыцця цяжкія. Купіць няма чаго, нават зараз улетку мала гародніны і садавіны”, “харчовыя крамы выглядаюць найгоршым чынам, ёсць толькі асобныя прадукты як хлеб, тлушч, маргарын, гарэлка і чыста рускай нацыянальнай вытворчасці – крупы, кашы. Такія прадукты як каўбаса, яйкі, масла, гародніна, узвары бываюць вельмі рэдка і ў такія дні дзяжурыць міліцыя. У прамтаварных крамах лепш, але на ўзроўні як у нас [у ГДР] у 1945 г. Ва ўсякім разе, гэтай краінай я расчараваны”. Замежнікаў уражваў не высокі ўзровень культуры савецкага гандлю: “За ўвесь час нашага знаходжання ў Магілёве, ніводная прадаўшчыца не звярнулася да нас са словамі “дзякуй”, “калі ласка”. У крамах няма абгорткавай паперы, газеты выкарыстоўваюць для пакавання тавараў” [5, арк. 21, 21адв.]. Безумоўна, у выказваннях адчувалася пэўная тэндыцыйнасць. Але сапраўды ў савецкі час была нізкая якасць абслугоўвання, у магазінах адсутнічалі некаторыя прадукты.

У выніку аператыўных дзеянняў Упраўленнем КДБ па Магілёўскай вобласці ад прадстаўнікоў фірмаў з ФРГ і Галандыі была атрымана каштоўная навукова-тэхнічная інфармацыя, якая па заключэнню аўтарытэтных спецыялістаў уяўляла цікавасць не толькі для прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці, але і для савецкай прамысловасці ў цэлым. Здабытыя матэрыялы былі перададзеныя для рэалізацыі на прадпрыемствах СССР і БССР [9, с. 82].

Такім чынам, інфармацыя супрацоўнікаў КДБ дазваляе сцвярджаць, што стварэнне ва ўсходніх рэгіёнах БССР буйнога прамысловага комплексу адбывалася з выкарыстаннем тэхналагічнага вопыту вядучых краін свету і імпартнага абсталявання, якое на той час з’яўлялася інавацыйным для айчыннай вытворчасці. Сумесная праца з замежнымі спецыялістамі дазволіла беларускім рабочым і інжынерна-тэхнічным работнікам глыбей пазнаёміцца з перадавымі тэхналогіямі, павысіць сваю кваліфікацыю, умацаваць кадравы патэнцыял Савецкай Беларусі. У выніку шэраг прамысловых прадпрыемстваў выйшлі на ўзровень, які адпавядаў тагачасным дасягненням навукі і тэхнікі і занялі вядучыя пазіцыі ў эканоміцы рэспублікі, а таксама СССР і Еўропы. На эфектыўнасць выкарыстання імпартнага абсталявання і замежных спецыялістаў уплывала не толькі эканамічная кан’юктура, але і знешнепалітычныя фактары, а таксама наяўнасць вялікай колькасці непаладак і недахопаў, характэрных для савецкага перыяду айчыннай гісторыі.


1. Войтович, С. Д. БССР в экономических отношениях СССР с зарубежными странами (1945–1987) / С. Д. Войтович. – Минск : Наука и техника, 1989. – 184 с.
2. Воробей, Н. С. Участие Белорусской ССР в отношениях Советского Союза с капиталистическими странами (50–70-е годы) / Н. С. Воробей. – Минск : Наука и техника, 1981. – 248 с.
3. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 6 : Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.). – Мінск : Современная школа, Экоперспектива, 2011. – 728 с.
4. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. – Кн. 2 / М. У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – 654 с.
5. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Магілёўскай вобласці (далей – ДАГАМаг). – Ф. 9. Воп. 151. Спр. 58.
6. ДАГАМаг. – Ф. 9. Воп. 165. Спр. 73.
7. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2-х ч. – Ч. 2 / А. П. Касцюк [і інш.] ; Інстытут гісторыі АНБ. – Мінск : Беларусь, 1995. – 560 с.
8. Несцяровіч, М. Эканамічнае становішча Беларусі (1970-я – першая палова 1980-х гг.) / М. Несцяровіч // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск : Бел. навука, 2014. – Вып. 29. – С. 201–208.
9. Пушкін, І. А. Кадравы патэнцыял прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў БССР (1944–1991) : манагр. / І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. – Магілёў : БДУТ, 2022. – 302 с.
10. Шадурский, В. Г. Культурные связи Беларуси со странами Центральной и Западной Европы (1945–1990-е гг.) / В. Г. Шадурский. – Минск : БГУ, 2000. – 285 с.


**Карпекін К.Р.**

## БІБЛІЯТЭКІ КУЛЬТАВЫХ БУДЫНКАЎ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў ПАЧАТКУ 1980-Х ГГ.

У 1982 г. супрацоўнікі Дзяржаўнага мастацкага музея БССР ажыццявілі экспедыцыю па культавых будынках, мэтай якой было выяўленне аб’ектаў культурнай вартасці, што знаходзіліся ў карыстанні рэлігійных абшчын. Апісанню і фотафіксацыі падлягалі розныя катэгорыі богаслужбовых прадметаў (абразы, крыжы, званы, святарская вопратка), у тым ліку і кнігі. На тэрыторыі Віцебшчыны навукоўцы наведалі 66 малітоўняў, сярод якіх – 41 праваслаўную царкву, 11 каталіцкіх касцёлаў і 14 стараабрадніцкіх малітоўных дамоў. Паколькі вопісы значных гісторыка-культурных

аб’ектаў утрымліваюць звесткі пра колькасць кніг, іх назвы, час і месца выдання, гэта дазваляе не толькі прааналізаваць стан бібліятэк рэлігійных абшчын пасля такіх значных сацыяльных катаклізмаў, як войны і працяглы перыяд савецкай антырэлігійнай палітыкі, але і атрымаць звесткі для выяўлення далейшага лёсу тых ці іншых старадрукаў.

Па выніках згаданага вышэй абследавання аказалася, што найбольш тыповымі з’яўляліся праваслаўныя цэрквы, якія мелі бібліятэкі з 20–49 тамоў богаслужбовых кніг (гл. табліцу). Увогуле ж, самыя багатыя зборы мелі Георгіеўская царква ў в. Сітца Докшыцкага раёна (81 асобнік) [3, арк. 3], а таксама Казанская царква ў г. Віцебску (78 тамоў) [1, арк. 5–9]. Бібліятэкі каталіцкіх касцёлаў даследуемага рэгіёна мелі значна больш сціплыя памеры: агульная колькасць кніг у кожнай з іх не перавышала 30. Палову складалі зборы да 10 кніг, і нават меўся адзін касцёл, у якім не было выяўлена ніводнай богаслужбовай кнігі (верагодна, вернікі прыносілі іх на набажэнствы з сабой). Што да бібліятэк стараабрадніцкіх храмаў, то паводле сваіх памераў яны займалі прамежкавае становішча паміж праваслаўнымі і каталіцкімі. Самымі распаўсюджанымі з’яўляліся стараабрадніцкія бібліятэкі з 10–19 кніг. Як правіла, колькасць выданняў, захоўваемых у храмах гэтай канфесіі, не перавышала 49, але мелася і адно выключэнне: у стараабрадніцкай малітоўні, якая размяшчалася ў Чыгуначным раёне г. Віцебска, налічвалася 78 разнастайных выданняў [13, арк. 8–10].

**Табліца – Памеры бібліятэк культавых будынкаў Віцебскай вобласці, 1982 г.**

| Колькасць кніг | Лік праваслаўных цэркваў з указанай колькасцю кніг | | Лік каталіцкіх касцёлаў з указанай колькасцю кніг | | Лік стараабрадніцкіх малітоўных дамоў з указанай колькасцю кніг | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | абсалютны лік | % | абсалютны лік | % | абсалютны лік | % |
| 0 | 0 | 0 | 1 | 9,1 | 1 | 7,1 |
| 1–9 | 1 | 2,4 | 6 | 54,5 | 2 | 14,3 |
| 10–19 | 5 | 12,2 | 3 | 27,3 | 5 | 35,8 |
| 20–29 | 10 | 24,4 | 1 | 9,1 | 2 | 14,3 |
| 30–39 | 9 | 22 | 0 | 0 | 2 | 14,3 |
| 40–49 | 8 | 19,6 | 0 | 0 | 1 | 7,1 |
| 50–59 | 3 | 7,3 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| 60–69 | 1 | 2,4 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| 70–79 | 3 | 7,3 | 0 | 0 | 1 | 7,1 |
| 80 і больш | 1 | 2,4 | 0 | 0 | 0 | 0 |

На прыкладзе віцебскай Казанскай царквы бачна, што ў царкоўных бібліятэках магло захоўвацца да 15 відаў разнастайных друкаваных выданняў, якія выкарыстоўваліся ў набажэнствах. У прыватнасці, значную долю сярод іх займалі “Мінеі” (каля 30% ад агульнага ліку), “Служэбнікі” (каля 14%), “Евангеллі” (у тым ліку напрастольныя) (каля 13%), нотныя зборнікі (каля 10%). У меншай ступені былі распаўсюджаны “Трыёдзі”, “Актоіхі”, “Псалтыры”, “Трэбнікі”, “Абіходы”, “Апосталы”, “Часасловы”, “Ірмалагіёны” і інш. (доля кожнага з пералічаных відаў звычайна не перавышала 7%).

Паводле часу выдання самымі распаўсюджанымі з’яўляліся кнігі, якія выйшлі ў свет у XIX ст. (больш за 50%). Дастаткова шмат мелася ў праваслаўных цэрквах і выданняў пачатку XX ст., а таксама 1950-х – 1970-х гг. (кожная група – прыкладна па 20%). Акрамя таго ў царкоўных бібліятэках Віцебшчыны захоўваліся богаслужбовыя кнігі XVIII ст. і 1920-х – 1930-х гг., але яны з’яўляліся рэдкімі (каля 3% і 5% адпаведна). З прыведзеных звестак вынікае, што аснову царкоўных бібліятэк складалі кнігі, выдадзеныя ў перыяд існавання Расійскай імперыі, калі праваслаўе з’яўлялася пануючай рэлігіяй. Гэтыя кнігі, як і выданні больш ранняга часу, не былі страчаны ў перыяд савецкай антырэлігійнай палітыкі. Больш за тое, у пасляваенны час праваслаўныя абшчыны мелі магчымасць дастаткова актыўна папаўняць свае бібліятэкі тымі ці іншымі богаслужбовымі кнігамі.

Самыя раннія царкоўныя выданні, выяўленыя ў праваслаўных храмах Віцебскай вобласці, датаваліся канцом XVII ст. У прыватнасці, ва Успенскай царкве г. Браслава захоўваліся “Мінеі” на студзень і ліпень 1691 г. [9, арк. 7] (гл. іл. 1).

Кнігі XVIII ст. меліся ў бібліятэках не менш як 10 праваслаўных цэркваў рэгіёна, іншымі словамі, у 25% храмаў. Напрыклад, у царкве Божай Маці Адзігітрыі г.п. Дзісна Мёрскага раёна захоўваліся напрастольныя “Евангеллі” 1703 г. і 1791 г., а таксама “Пяцідзясятніца” 1777 г. [2, арк. 4] (гл. іл. 2), у Ільінскай царкве г. Оршы – “Мінеі” на 1754, 1771, 1788 гг. [5, арк. 6–7], у Праабражэнскай царкве г. Чашнікі – “Мінея” на люты 1724 г. [6, арк. арк. 3], у Праабражэнскай царкве ў в. Смальяны Аршанскага раёна – “Новы Запавет” 1798 г. [7, арк. 3] і інш.

Варта адзначыць, што ў 1982 г. у некаторых праваслаўных цэрквах былі выяўлены і стараабрадніцкія выданні (такія выпадкі з'яўляліся адзінкавымі). Так, у Ільінскай царкве г.п. Бешанковічы захаваўся "Абіходнік" XIX ст. [4, арк. 4], а ў Спаса-Праабражэнскім храме в. Копысь Аршанскага раёна – стараабрадніцкі "Каноннік", які таксама датаваўся XIX ст. [8, арк. 3].

У сувязі з тым, што ў вопісах аб'ектаў, выяўленых у культавых будынках, не заўсёды пазначана месца выдання, не ўяўляецца магчымым ажыццявіць поўны аналіз. Тым не менш, нават па прыкладных дадзеных бачна, што значную долю складала прадукцыя маскоўскіх выдавецтваў (не менш за 60%). Асобныя кнігі траплялі ў цэрквы віцебскага рэгіёна з Санкт-Пецярбурга, Кіева (у прыватнасці – з Кіева-Пячэрскай лаўры), Пінска, Варшавы, Вены і інш. [1, арк. 5–9].

Што тычыцца бібліятэк каталіцкіх касцёлаў, то каля 60% ад агульнай колькасці складалі "Мшалы", адносна шматлікімі з'яўляліся "Rituale Romanum" (да 10%). Астатнія ж выданні (Біблія, канцыяналы і інш.) ў асноўным уяўлялі сабой адзінкавыя экзэмпляры, якія былі прадстаўлены далёка не ў кожным культавым будынку, таму немагчыма казаць пра пэўны тыповы склад бібліятэкі каталіцкага касцёла ў гэты перыяд.

Паводле храналагічнай прыкметы кнігі касцёльных бібліятэк размяркоўваліся наступным чынам: прыкладна аднолькавыя долі складалі асобнікі, выдадзеныя ў XIX ст., 1920-я – 1930-я гг. і 1950-я – 1970-я гг. (кожная група – ад 30% да 33%). Нязначна саступалі ім па колькасці выданні пачатку XX ст., якія займалі каля 20% ад агульнага ліку. Нарэшце, як і ў праваслаўных цэрквах, кнігі XVIII ст. з'яўляліся дастаткова рэдкімі (да 2%).

Кнігі, захоўваемыя ў бібліятэках касцёлаў, як правіла, пабачылі свет у заходнееўрапейскіх і прыбалтыйскіх друкарнях. Так, каля 30% выданняў былі прывезены з г. Катавіцэ, 25% – з г. Рэгенсбурга, 20% – з г. Парыжа, 15% – з г. Вільнюса. Таксама меліся кнігі, выдадзеныя ў г. Рыме, г. Познані і інш., але яны былі не асабліва распаўсюджанымі [10, арк. 3; 11, арк. 3–4].

У зборах стараабрадніцкіх малітоўных дамоў Віцебшчыны налічвалася каля 30 відаў разнастайных выданняў. Самым шматлікім з іх, як дарэчы, і ў праваслаўных цэрквах, з'яўляліся "Мінеі" (іх доля сярод агульнага ліку дасягала амаль 30%). Колькасць астатніх відаў кніг у параўнанні з "Мінеямі" была значна меншай. У прыватнасці, на "Ірмалагіёны" прыходзілася 12% складу стараабрадніцкіх бібліятэк, на "Евангеллі" – каля 10%, на "Часасловы" – амаль 7%, на "Трыёдзі" – 6%, на "Актоіхі", "Апосталы", "Шастадневы", "Псалтыры" і "Пралогі" – па 3–5%. Дастаткова рэдкімі з'яўляліся такія богаслужбовыя кнігі, як "Кормчая", "Літургіён", "Канонік", "Златавуст" і інш.

Бібліятэкі стараабрадніцкіх храмаў амаль цалкам складаліся з выданняў XIX – пачатку XX ст. (калі дакладней, то кнігі XIX ст. займалі 43%, кнігі пачатку XX ст. – 46% ад агульнага ліку). У адрозненне ад бібліятэк праваслаўных цэркваў і каталіцкіх касцёлаў доля кніг, выдадзеных да XIX ст., была значна вышэйшай. Больш за тое, у некаторых стараабрадніцкіх малітоўнях захоўваліся стадрукі не толькі XVIII ст., але таксама і XVI – XVII стст. У прыватнасці, на долю кніг XVI ст. прыходзілася ў сярэднім 0,6% складу бібліятэк (гл. іл. 3), XVII ст. – 5,9%, XVIII ст. – 3,7%. Крайне нешматлікімі былі і богаслужбовыя кнігі 1920-х гг. (0,6% складу), а больш позніх выданняў у малітоўных дамах не ўтрымлівался зусім.

Паводле часу выдання, найбольш прыкметнымі з'яўляюцца "Мінея агульная" на 1627 г. і "Мінея" на сакавік 1646 г. са стараабрадніцкай царквы ў в. Ніўнікі Мёрскага раёна [17, арк. 3], "Евангелле" 1638 г. з царквы ў в. Відзы Браслаўскага раёна [13, арк. 1 адв.], "Псалтыр" 1641 г. з царквы ў в. Мінкавічы Браслаўскага раёна [16, арк. 2], "Мінеі" на студзень 1644 г. і жнівень 1646 г. з царквы г. Віцебска [14, арк. 10].

Калі геаграфія выданняў праваслаўных і каталіцкіх богаслужбовых кніг была дастаткова разнастайнай, то стараабрадніцкія абшчыны карысталіся амаль выключна прадукцыяй, падрыхтаванай у маскоўскіх друкарнях (больш за 90%) (гл. іл. 4). Толькі адзінкавыя экзэмпляры былі аддрукаваны ў г. Гродна, г. Вільні, г. Кіеве, а таксама ў Куцеінскім, Пачаеўскім і Супрасльскім манастырах.

Такім чынам, паводле стану на пачатак 1980-х гг. бібліятэкі культавых будынкаў Віцебшчыны адрозніваліся паміж сабой, што з'яўлялася вынікам іх канфесійнай прыналежнасці. Па шматлікасці ў дадзены перыяд найбольш багатымі варта лічыць зборы праваслаўных цэркваў і стараабрадніцкіх малітоўных дамоў, а найбольш сціплымі – сховішчы каталіцкіх касцёлаў. Што да відавой разнастайнасці, то яна таксама была ў большай ступені характэрна для праваслаўных і стараабрадніцкіх бібліятэк. Паводле часу выдання богаслужбовых кніг найбольш раўнамернае размеркаванне назіралася ў каталіцкіх зборах. У той жа час стараабрадніцкія бібліятэкі адрозніваліся наяўнасцю кніг, выдадзеных у XVI–XVII стст., што было зусім не ўласціва для праваслаўных цэркваў і касцёлаў. Нарэшце, і праваслаўныя, і каталіцкія абшчыны карысталіся прадукцыяй цэлага шэрагу выдавецтваў, стараробрадніцкія ж, як правіла, абмяжоўваліся друкарнямі г. Масквы.



1. "Мінея" на ліпень 1691 г., выдадзеная ў г. Маскве, з праваслаўнай Успенскай царквы г. Браслава [9, арк. 110]



2. "Пяцідзясятніца" 1777 г., выдадзеная ў г. Маскве, з праваслаўнай царквы Божай Маці Адзігітрыі ў г.п. Дзісна Мёрскага раёна [2, арк. 72]



3. "Евангелле", выдадзенае ў г. Вільні ў 1575 г., са стараабрадніцкай царквы ў в. Булаўнікі Браслаўскага раёна [12, арк. 23]



4. "Абіход", выдадзены ў г. Маскве ў 1911 г., са старaабрадніцкай царквы ў в. Кукляны Пастаўскага раёна [15, арк. 56].


1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей – ДАВц). – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 1.
2. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 2.
3. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 4.
4. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 6.
5. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 7.
6. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 27.
7. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 28.
8. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 34.
9. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 39.
10. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 42.
11. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 44.
12. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 54.
13. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 55.
14. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 56.
15. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 61.
16. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 64.
17. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 66.


**Паўлава А.Я.**

## МАТЭРЫЯЛЫ АБ ДЗЕЙНАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АКАДЭМІЧНАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА Ў ФОНДАХ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА-МУЗЕЯ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа з'яўляецца візітнай карткай г. Віцебска. Праз 3 гады тэатр адзначыць стогадовы юбілей. У 2009 г. выйшла манаграфія віцебскай мастацтвазнаўцы Т.В. Катовіч, напісаная з выкарыстаннем дакументаў ДАВВ. Між тым, асноўныя дакументальныя зборы аб коласаўскім тэатры знаходзяцца ў Мінску.